УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
______________________Ю.П.Бондар
“____” _________________2012 г.

ВУЧЕБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Сцэнічная мова і голасамоўны трэнінг

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-17 03 72 Эстрадны вакал
кваліфікацыя: артыст – выкладчык вакалу
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 03.11.2010 г. № 25 – 17/195

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск, 2012

Распрацоўнік праграмы: Акулёнак Алена Мікалаеўна,ст.выкладчык кафедры тэатральнай творчасці УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад _________ № ______

Навукова-метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад __________ № ______

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Праграма дысцыпліны "Сцэнічная мова і голасамоўны трэнінг" прызначана для слухачоў спецыяльнасці "Эстрадны вакал". Гэта дысцыпліна належыць да блока базавых навучальных дысцыплін, якія накіраваны на развіццё спецыфічных прафесійных навыкаў і ўменняў, неабходных для плённага і гарманічнага існавання на сцэне. Важна падкрэсліць, што мастацкае слова – асноўны выразны сродак, з якім працуе выканаўца-вакаліст на сцэне.

Метадычным падмуркам прадмета з'яўляецца сістэма К.С.Станіслаўскага. Таму курс грунтуецца на падыходзе і прынцыпах, якія сфармуліраваны К.С.Станіслаўскім і ў асноўным засвойваецца праз практычныя заняткі. Палажэння сістэмы абумоўліваюць спецыфіку заняткаў па двум асноўным блокам дысцыпліны – работа над мастацкім тэкстам і правядзенне комплекснага голаса-моўнага трэнінга.

У працэсе навучання слухачы павінны азнаёміцца з галоўнымі прыёмамі работы выканаўца з моўным апаратам і выразнымі моўнымі сродкамі артыста, засвоіць першапачатковыя навыкі работы з рознымі моўнымі жанрамі.

***Мэтамі*** дысцыпліны з'яўляюцца развіццё агульнай моўнай культуры і фарміраванне асноў выканальніцкага майстэрства слухача.

***Задачы*** навучання:

1) фарміраванне ў слухачоў ведаў пра асновы тэхнікі і культуры мовы;

2) развіццё навыкаў моўнай дзейнасці;

3) развіццё ўменняў выкарыстоўваць вербальныя і невербальныя сродкі выразнасці мовы (тэмпарытм, паўза, націск, інтанацыя, поза, міміка, жэст і інш.) у працы над мастацкім тэкстам;

5) развіццё і актуалізацыя творчых, інтэлектуальных і фізічных магчымасцей слухачоў;

Рэалізацыі гэтых задач служаць асноўныя раздзелы дысцыпліны: "Тэхніка мовы", "Культура мовы" і "Работа над тэкстам".

У выніку вывучэння дысцыпліна слухач павінен:

- ведаць асновы тэхнікі і культуры мовы;
- ведаць асноўныя прыёмы працы выканаўцы з маўленчую апаратам і выразным мовай артыста.

Курс разлічаны на 68 гадзін, з якіх 6 гадзін - лекцыі, 30 гадзін - практычныя заняткі, 32 гадзіны - самастойная праца. Форма выніковага кантролю экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекции | Практыч. | Самост. работа | Усяго |
| 1. | Уводзіны ў дысцыпліну | 2 | - | - | 2 |
| 2. | К.С.Станіслаўскі аб сцэнічнай мове | - | - | 2 | 2 |
| 3. | Методыка работы над мастацкім тэкстам | - | 2 | 4 | 6 |
| 4. | Тэхніка мовы | - | 4 | 2 | 6 |
| 5. | Асновы слоўнага дзеяння | 2 | 6 | 4 | 12 |
| 6. | Логіка мовы. Паняцце перспектывы ў рабоце над тэкстам | 2 | 2 | 2 | 6 |
| 7. | Апісальная проза | - | 2 | 2 | 4 |
| 8. | Паэзія | - | 4 | 4 | 8 |
| 9. | Характарная і псіхалагічная проза | - | 2 | 4 | 6 |
| 10. | Маналог | - | 2 | 4 | 6 |
| 11. | Літаратурна-музычная кампазіцыя | - | 6 | 4 | 10 |
| | **Усяго** | **6** | **30** | **32** | **68** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### Тэма 1. Уводзіны ў дысцыпліну

Змест дысцыпліны "Сцэнічная мова і голасамоўны трэнінг". Мэты і задачы дысцыпліны. Асноўныя раздзелы сцэнічнай мовы: культура мовы, тэхніка мовы, работа над тэкстам. Мастацкае слова ў сістэме работы над сцэнічнай мовай. Месца сцэнічнай мовы ў структуры спецыяльных дысцыплін.

### Тэма 2. К.С.Станіслаўскі аб сцэнічнай мове

Месца і роля сцэнічнага слова ў сістэме К.С.Станіслаўскага. К.С.Станіслаўскі пра заняткі мастацкім словам. Голас і мова. Спевы і дыкцыя. Перспектыва мовы. Перспектыва артыста і ролі. Падтэкст. Бачанні, кіналента бачання. Тэмпарытм. Логіка і паслядоўнасць. Характарнасць. Слоўнае дзеянне і ўзаемадзеянне. Моўная тэхніка. Законы мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 3. Методыка работы над мастацкім тэкстам

*Ідэйна-тэматычны і падзейна-дзейсны аналіз тэксту.* Значэнне ідэйна-тэматычнага і падзейна-дзейснага аналізу тэксту. Аўтар і гістарычны кантэкст. Тэма. Ідэя. Аўтарская і выканальніцкая звышзадача. Падзейны рад. Ідэйны сэнс твора. Скразное дзеянне і звышзадача ў літаратурным тэксце. Перспектыва чытальніка. Слоўнае дзеянне.

*Вобразна-эмацыянальны аналіз тэксту.* Значэнне вобразна-эмацыянальнага аналізу пры засваенні тэксту. Работа над бачаннем (кіналента бачання па К.С.Станіслаўскаму). Тэмпарытм. Інтанацыя як сродак рэалізацыі моўнага дзеяння.

*Лагічны аналіз тэксту.*

### Тэма 4. Тэхніка мовы

Роля і значэнне тэхнікі мовы ў моўным дзеянні. Анатомія і фізіялогія органаў дыхання. Тэхніка сцэнічнага гучання. Фанацыйнае дыханне. Голас. Тэорыя голасаўтварэння. Роля рэзанатараў у рабоце над голасам. Дыкцыя. Выразнасць і яснасць вымаўлення.

### Тэма 5. Асновы слоўнага дзеяння

Роля і значэнне слоўнага дзеяння ў выканальніцкім матэрыяле. Агульнае і рознае ў майстэрстве мастацкага слова, драматычнага мастацтва і гутарковай мовы. Спосабы зносін з аўдыторыяй. Сродкі ўзаемадзеяння чытальніка з аўдыторыяй.

Задача чытальніка. Задача персанажа. Звышзадача. Сродкі акцёрскай выразнасці і моўная камунікацыя. Зносіны. Прамыя і ўскосныя зносіны.

**Тэма 6. Логіка мовы. Паняцце перспектывы ў рабоце над тэкстам**

Лагічная паўза і лагічны націск. Лагічнае чытанне складаных перыядаў. Лагічная перспектыва тэксту. Лагічны аналіз тэксту. Інтанаванне знакаў прыпынку. Маўленчы такт. Першы і другі фразавы націск. Тэкст і падтэкст.

Значэнне перспектывы ў рабоце над тэкстам. Скразное дзеянне і перспектыва. Звышзадача і перспектыва. Лагічная перспектыва. Мастацкая перспектыва. Выканальніцкая перспектыва.

**Тэма 7. Апісальная проза**

Значэнне вывучэння і засваення асаблівасцей апісальнай прозы ў падрыхтоўцы студэнтаў па спецыяльнасці "Народная творчасць" (тэатральная творчасць). Выбар высокамастацкага матэрыялу. Асаблівасці апісальнай прозы. Эмацыянальна-вобразнае засваенне тэксту. Лагічны аналіз тэксту. Непарыўнасць кіналенты бачання.

**Тэма 8. Паэзія**

Віды паэзіі. Асноўныя прыметы вершаванай мовы. Асновы вершаскладання; гукавая палітра верша; асноўныя паняцці метра і рытму, стапы, радка, страфы; рыфмы і іх тыпы, памер, тропы і інш. Аналіз і засваенне вершаванага матэрыялу.

**Тэма 9. Характарная і псіхалагічная проза**

Характарная мова. Моўная характарыстыка герояў. Моўны партрэт, моўны шарж. Вербальныя і невербальныя сродкі выразнасці (мізансцэна, поза, міміка, жэст). Вобраз выканаўцы.

Псіхалагічная характарыстыка персанажа. Тэкст і падтэкст. Унутранае жыццё героя. Унутраны маналог. Знешні і ўнутраны канфлікт. Засваенне прапанаваных абставін, стылістычныя асаблівасці аўтарскага тэксту.

**Тэма 10. Маналог**

Асноўныя задачы і прынцыпы работы над тэкстам ад першай асобы. Празаічны і паэтычны маналог. Аналіз асноўных асаблівасцей мовы і стылю аўтара. Скразное дзеянне. Канфлікт: унутраны, знешні. Аб'ект увагі расказчыка.

**Тэма 11. Літаратурна-музычная кампазіцыя**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асновы літаратурнай кампазіцыі. Структурная пабудова кампазіцыі. Тэма. Ідэя. Звышзадача. Прынцыпы мантажнай драматургіі. Ад цыкла да кампазіцыі. Віды кампазіцыі (тэматычная, храналагічная, дыялагічная і інш.). Роля музычнага афармлення ў літаратурнай кампазіцыі. Стылёвае адзінства літаратурнага і музычнага матэрыялаў.

## ЗАДАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

1. Саставіць апорны канспект "К.С.Станіслаўскі аб сцэнічнай мове".
2. Саставіць апорны канспект па тэме "Логіка мовы".
3. Самастойная работа па ўдасканаленню моўных асаблівасцяў, недахопаў. Работа над дыкцыяй (скорагаворка, чыстагаворка).
4. Работа над моўнымі жанрамі (пошук моўных выразных сродкаў і работа над моўным дзеяннем у жанрах апісальнай, характарнай, псіхалагічнай прозы, работа над маналогам, вершаваным творам).
5. Пошук матэрыялу для стварэння музычна-літаратурнай кампазіцыі.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

На экзамене слухачы павінны прадэманстраваць валоданне асновамі слоўнага дзеяння. Таму экзамен праходзіць у форме творчага паказу, які грунтуецца на выкананні літаратурных матэрыялаў любога жанру (характарная, псіхалагічная проза, казка, маналог, вершаваныя творы альбо літаратурна-музычная кампазіцыя). Прыярытэтным жанрам для экзамена з'яўляецца літаратурна-музычная кампазіцыя. У прапануемым выканальніцкім нумары слухач павінен прадэманстраваць першапачатковае валоданне выразнымі моўнымі сродкамі, уменне дзейнічаць словам.

## ЛІТАРАТУРА

### *Асноўная*


1. *Запорожец, Т.И.* Логика сценической речи: учеб. пособие для театр. и культ.-просвет. учеб. заведений. – М.: Просвещение, 1974. – 128 с.
2. *Искусство речи*: учеб. пособие для театр. учеб. заведений / Н.П.Вербовая, О.М.Головина, В.В.Урнова. – 2-е изд. – М.: Искусство, 1977. – 304 с.
3. *Козлянинова, И.П.* Сценическая речь. Учеб. пособие для сред. театр. и культ.-просвет. учеб. заведений и ин-тов культуры. Под. ред. И.П. Козляниновой. – М.: Просвещение, 1976. – 336 с.
4. *Литературный энциклопедический словарь* / Под общ. ред. В.М.Кожевникова, П.А.Николаева. – М.: Советская энциклопедия, 1987. – 752 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Станиславский, К.С.* Моя жизнь в искусстве. – М.: Вагриус, 2000. – 448с.
6. *Станиславский, К.С.* Работа актера над собой: Части I и II. – М.: Искусство, 1951. – 667 с.
7. *Холшевников, В.Е.* Основы стихосложения: Русское стихосложение. – СПб.: Филологический факультет СПбГУ; М.: Издательский центр "Академия", 2002. – 208 с.

***Дадатковая***

1. *Введенская, Л.А.* Культура речи: Учеб. пособие. – Ростов н/Д: Феникс, 2000. – 448 с.
2. *Виноградов, В.В.* Проблема авторства и теория стилей. – М.: Художественная литература, 1961. – 614 с.
3. *Галендеев, В.Н.* Учение К.С.Станиславского о сценической речи: Учеб. пособие. − Л.: ЛГИТМиК им. Н.К.Черкасова, 1990. – 148 с.
4. *Савкова, З.В.* Как сделать голос сценическим. М.: Искусство, 1975. – 176 с.
5. *Саричева, Е.Ф.* Техника сценической речи. – М.: Искусство, 1939. – 108с.
6. *Театр, где играют дети*: Учеб.-метод. пособие для руководителей детских театральных коллективов / Под ред. А.Б. Никитиной. – М.: ВЛАДОС, 2001. – 288 с.
7. *Юрский, С.Ю.* Кто держит паузу. – Л.: Искусство, 1977. – 175 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ